# Гісторыя даўжынёю ў стагоддзе

2017 год – юбілейны для органаў запісу актаў грамадзянскага стану. Гісторыя органаў загса нашай краіны пачала свой адлік з 18 снежня 1917 года. Дата 18 снежня была выбрана не выпадкова. Менавіта ў гэты дзень быў прыняты Дэкрэт Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта Савета народных камісараў РСФСР "Аб грамадзянскім шлюбе, аб дзецях і аб вядзенні кніг актаў грамадзянскага стану".

У календары Дзяржаўных свят, на жаль, пакуль няма такога свята. Але ён павінен быць, паколькі за 100 гадоў органы загса сталі неад'емнай часткай нашага грамадства. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што гісторыя органаў загса – гэта гісторыя краіны, бо менавіта гэтыя органы рэгіструюць нараджэнне і смерць, шлюб і скасаванне шлюбу, перамену імені і ўсынаўленне, устанаўленне бацькоўства – усе найбольш значныя вехі ў лёсе кожнага чалавека.

Аж да Кастрычніцкай рэвалюцыі функцыі рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану выконвалі культавыя ўстановы, якія мелі сваё справаводства. Асобы, якія бралі шлюб, спалучалі свае лёсы ўрачыстым вянчаннем пад купаламі храмаў. У метрычных кнігах рабіўся запіс аб бяручых шлюб, пасля чаго шлюб прызнаваўся законным.

У 1721 годзе па Указе Пятра I царкоўныя ўстановы былі ўключаны ў сістэму дзяржаўных органаў Расіі і ўсё праваслаўнае насельніцтва Расійскай імперыі прыпісана да царкоўных прыходаў па месцы пражывання. Пачынаючы з 1722 года, нараджэнне, шлюб і смерць сталі ўлічвацца ў метрычных кнігах. Другіх відаў запісаў, якія вядуць сучасныя органы ЗАГС, не існавала.

Метрычныя кнігі – сукупнасць актаў культавай рэгістрацыі, якія сведчаць падзеі хрышчэння (нараджэння), вянчання (шлюбу), пахавання (смерці) канкрэтных асоб, у выглядзе храналагічных запісаў у кніжнай форме. Метрычныя кнігі – гэта найважнейшы і адзіны дакумент, які пацвярджае факт нараджэння, заключэння шлюбу або смерці, які можа дапамагчы ўстанавіць блізкія адносіны. Метрычныя кнігі можна назваць асноўнай дакументальнай крыніцай пры вывучэнні гісторыі роду. Метрычныя кнігі запаўняліся ў цэрквах і ў касцёлах. Рабіў гэта той святар, які ахрысціў, вянчаў і адпяваў прыхаджан свайго прыходу. На працягненні доўгіх гадоў органы загса беражліва захоўвалі гэтыя кнігі.

У архіве аддзела загса Бераставіцкага райвыканкама знаходзіліся на захоўванні 24 метрычныя кнігі культавых устаноў нашага раёна. Яны ўключалі ў сябе 5 544 метрычных запісаў. У цяперашні час метрычныя кнігі ўсіх культавых устаноў Бераставіцкага раёна перададзены на пастаяннае захоўванне ў ДУ «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна», размешчаны па адрасе: вул. Гаспадарчая, 21, г. Гродна.

Сістэма органаў загса развівалася разам з дзяржавай і прайшла ў сваім развіцці складаныя перыяды.

Дэкрэт ад 18 снежня 1917 г. устанавіў, што Расійская Рэспубліка надалей прызнае толькі грамадзянскія шлюбы. Царкоўны шлюб аб'яўляўся

прыватнай справай і не параджаў ніякіх праў і абавязкаў для асоб, якія бралі шлюб. Рэгістрацыя шлюбу, як і другіх актаў грамадзянскага стану, ускладалася на органы Савецкай улады (аддзелы запісаў шлюбаў і нараджэнняў). Дэкрэт вызваляў шлюб ад ранейшых абмежаванняў, такіх як прыналежнасць асоб, якія бяруць шлюб, да пэўнай веры, нацыянальнасці. Для ўступлення ў шлюб патрабавалася згода асоб, якія бяруць шлюб, і дасягненне шлюбнага ўзросту (18 гадоў для мужчын і 16 гадоў для жанчын). Забараняліся шлюбы паміж сваякамі па прамой лініі, паўнароднымі і непаўнароднымі братамі і сёстрамі, з асобамі, якія знаходзяцца ў шлюбе, а таксама са звар'яцелымі. Дэкрэт раўнаваў пазашлюбных дзяцей і дзяцей, народжаных у шлюбе, адносна праў і абавязкаў як бацькоў да дзяцей, так і дзяцей да бацькоў.

19 снежня 1917 г. Усерасійскім цэнтральным выканаўчым камітэтам Савета народных камісараў РСФСР быў прыняты дэкрэт «Аб скасаванні шлюбу», які адмяніў складаны шлюбаразводны працэс і ўвёў свабоду скасавання шлюбу пад кантролем дзяржавы.

Наступным этапам у гісторыі органаў загса стала прыняцце 16 верасня 1918 г. Кодэкса законаў аб актах грамадзянскага стану, шлюбным, сямейным і апякунскім праве РСФСР. Новы заканадаўчы акт пацвярджаў юрыдычную сілу грамадзянскага шлюбу, свабоду ўступлення ў шлюб і свабоду скасавання шлюбу, аднашлюбнасць, ураўноўванне пазашлюбных дзяцей з дзецьмі, народжанымі ў шлюбе. У той жа час ён устанавіў рад новых палажэнняў. Кодэкс 1918 гада рэгуляваў правы і абавязкі мужа і жонкі, правы і абавязкі дзяцей і бацькаў, рэгламентаваў устанаўленне і ажыццяўленне апекі, забараняў усынаўленне. Кодэкс РСФСР 1918 гада дзейнічаў на тэрыторыі БССР да 1927 года.

27 студзеня 1927 г. быў прыняты Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы Беларускай ССР, які быў уведзены ў дзеянне з 1 сакавіка 1927 г. Кодэкс павысіў узрост жанчыны для ўступлення ў шлюб да 18 гадоў. Забаранялася ўступаць у шлюб псіхічнахворым і прыдуркаватым, а таксама асобам, якія часова знаходзяцца ў стане, калі яны не могуць разумець значэнні сваіх учынкаў. Цікавым з'яўляецца і той факт, што Кодэкс БССР 1927 г. прызнаваў юрыдычную сілу не толькі за зарэгістраванымі шлюбамі, але і за фактычнымі. Асобам, якія знаходзяцца ў фактычным шлюбе, давалася права ў любы час аформіць свае адносіны, зарэгістраваўшы шлюб з указаннем тэрміну сумеснага жыцця. Фактычныя муж і жонка былі зраўнаваны з мужам і жонкай, якія зарэгістравалі шлюб, у правах на сумесна нажытую маёмасць і на атрыманне аліментаў. Змяніўся парадак устанаўлення бацькоўства і парадак скасавання шлюбу, размяжоўваліся паняцці апекі і папячыцельства, спецыяльны аддзел быў адведзены інстытуту ўсынаўлення.

З зацвярджэннем 27 чэрвеня 1968 г. Асноў заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб шлюбе і сям'і пачаўся новы этап у развіцці шлюбна-сямейнага заканадаўства - шлюбна-сямейнае заканадаўства саюзных рэспублік было прыведзена ў адпаведнасць з Асновамі заканадаўства аб

шлюбе і сям'і. 13 чэрвеня 1969 г. быў прыняты Кодэкс аб шлюбе і сям'і Беларускай ССР.

Трэба адзначыць, што акрамя кодэксаў у розны час былі прыняты і дзейнічалі іншыя акты заканадаўства аб шлюбе і сям'і.

Важным крокам у гісторыі органаў загса з'яўляецца ўступленне ў сілу 1 верасня 1999 г. Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і. Кодэкс рэгулюе як дачыненні, якія існавалі ў ранейшым заканадаўстве і не страцілі сваёй актуальнасці, так і новыя.

Аддзел загс Бераставіцкага райвыканкама пачынае сваю гісторыю з 2 студзеня 1945 г. Менавіта ў гэты дзень быў здзейснены першы запіс акта грамадзянскага стану – запіс акта аб заключэнні шлюбу, і зрабіла гэты запіс загадчыца бюро загс Рудзяк Зінаіда Іосіфаўна. Зінаіда Іосіфаўна прапрацавала ў загсе да 1963 года.




Наступныя чатырнаццаць гадоў бюро загс кіравала Вольга Васільеўна С'янава.

У студзені 1976 г. бюро загс было перайменавана ў аддзел запісу актаў грамадзянскага стану. У 1976 – 1978 гадах на пасадзе загадчыцы аддзела загса працавала Шпакоўская Ганна Іосіфаўна.

У студзені 1978 года на пасаду загадчыцы аддзелам загса была прызначана Левоненя Ала Аляксееўна, якая цэлых дваццаць восем гадоў аддала сваёй працы. Сярод якасцяў, уласцівых Але Аляксееўне, можна вылучыць любоў да людзей і да сваёй прафесіі, здольнасць да суперажывання, душэўную цеплыню, асабістую абаяльнасць. Яна дасведчаны, мудры спецыяліст, таленавіты кіраўнік.

У лютым 1984 года ў аддзеле загса была ўведзена пасада інспектара, на якую была прызначана Сідаркевіч Галіна Міхайлаўна. Галіна Міхайлаўна працавала на гэтай пасадзе да жніўня 2011 года. Гэта прафесіянал у лепшым сэнсе гэтага слова, якая дасканала ведала шлюбна-сямейнае заканадаўства. Яна валодала такімі выдатнымі якасцямі, як тактоўнасць, добразычлівасць,

уважлівасць і павага да людзей. Гэта вельмі вопытны і ўважлівы настаўнік, які выхаваў не аднаго супрацоўніка аддзела загса.



З 1 лютага 2007 г. па красавік 2008 года абавязкі начальніка аддзела загса выконвала Людміла Аляксееўна Башкевіч, граматны спецыяліст, мудры кіраўнік. Зараз Людміла Аляксееўна кіруе аддзелам загса Гродзенскага райвыканкама.



У цяперашні час у аддзеле загса працуюць Сцепанчук Святлана Раманаўна, начальнік аддзела загса, і Карпуць Наталля Георгіеўна, галоўны спецыяліст аддзела загса.



Доўгі час у аддзела загса не было ўласнага памяшкання. Да верасня 1993 г. аддзел загс Бераставіцкага выканкама раённага Савета народных дэпутатаў размяшчаўся па вуліцы Леніна, д. 11.

.



З верасня 1993 г. па снежань 2005 г. размяшчаўся ў будынку былога райкама партыі па вуліцы Чырвонаармейскай, д. 4.



Да студзеня 2006 г. урачыстая рэгістрацыя актаў грамадзянскага стану праводзілася ў раённым Доме культуры.



Яркай падзеяй для Бераставіцкага раёна стала ўрачыстае адкрыццё 21 студзеня 2006 г. новага будынка аддзела загса. У гэты прыгожы зімовы дзень было зарэгістравана два шлюба.



25 студзеня 2006 года **"БЕРАСТАВІЦКАЯ ГАЗЕТА"**

ПАДЗЕЯ

# Вяселле запомніцца на ўсё жыццё

## У Вялікай Бераставіцы адкрыта новая зала для рэгістрацыі шлюбу

А маладым у той дзень маглі пазайздросціць многія. Самы шчаслівы для іх дзень прыпаў на другое свята. У суботу адбылося ўрачыстае адкрыццё ЗАГСа. Цяпер зарэгістрыраваць шлюб можна будзе ў асобным памяшканні, якога, дарэчы, раней не было. Аблвыканкам і райвыканкам выдзелілі сродкі для збудавання залы для абрадаў, якая знаходзіцца ў адным будынку з падаткавай інспекцыяй па адрасу: вул.Савецкая,29.Тут цяпер будзе адбывацца адна з самых радасных падзей сямейнага жыцця.

Яшчэ да прыбыцця маладых зала для абрадаў, і ўсе прылягаючыя памяшканні былі асвечаны благачынным айцом Сергіем і ксяндзом Андрэем. На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця ЗАГСа прысутнічалі старшыня раённага Савета дэпутатаў Р.У.Курыла, намеснікі старшыні райвыканкама С.Я.Чыкун, Н.Г.Мікульчык, А.М.Рахуба, начальнік аддзела адукацыі Э.У.Карвацкі, начальнік аддзела культуры І.У.Лябецкі і многія іншыя. Маладых сустрэлі "Бераставіцкія музыкі", якія не толькі сказалі шмат прыгожых слоў у іх адрас, але і праспявалі песню. Пасля гэтага магчымасць перарэзаць чырвоную стужку была дадзена старшыні раённага Савета дэпутатаў Р.У.Курылу і загадчыцы аддзела ЗАГСа райвыканкама А.А.Леванені. Маладыя і іх госці былі запрошаны ў залу для абрадаў, дзе і прайшла цырымонія шлюбу. Правяла яе А.А.Леваненя, а напрыканцы першым слова для віншавання ўзяў старшыня раённага Савета дэпутатаў Р.У.Курыла. Ён уручыў маладым падарунак ад раённага Савета дэпутатаў і райвыканкама.

Гучалі жывая музыка, прыгожыя песні, віншаванні бацькоў, блізкіх і сяброў. Што і казаць, нягледзячы на шчодры мароз, які дорыць гэта зіма, маладая сям'я Вярэніч запомніць вяселле на ўсё жыццё.

**Вольга Ярэміч.**

Наваселле аддзела загса здзейснілася дзякуючы намаганням і старанням кіраўніцтва нашага раёна, а таксама грашовым сродкам, якія былі выдзелены райвыканкамам і аблвыканкамам.








29


ИНФОРМАЦИЯ


ПО ПРИНЦИПУ "ОДНО ОКНО"
«ОДНО ОКНО»
ОРГАНАМ ЗАГСА
БЕЛАРУСЬ
100 ЛЕТ





Сістэма органаў загса развівалася разам з дзяржавай і прайшла складаныя перыяды ў сваім развіцці, абумоўленыя гістарычнымі падзеямі і эканамічнымі цяжкасцямі. З дня свайго узнікнення яны не спынялі сваю дзейнасць нават у самых складаных умовах, накопліваючы бясцэнны архіў. Усе змяненні ў краіне, у жыцці кожнага чалавека знайшлі сваё адлюстраванне ў дакументах органаў загса, асэнсавана іх унікальнасць. Органы загса прайшлі вялікі і складаны шлях развіцця, склаліся традыцыі, назапашаны вялікі вопыт работы.

У ходзе гістарычнага развіцця мянялася ведамасная падпарадкаванасць органаў загса, якую можна прасачыць на прыкладзе аддзела загса Бераставіцкага райвыканкама:

- бюро запісу актаў грамадзянскага стану Бераставіцкага раёна Упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскай вобласці БССР. 2 студзеня 1945 г. здзейснены першы запіс акта грамадзянскага стану;

- бюро запісу актаў грамадзянскага стану Бераставіцкага раёна Упраўлення міліцыі Гродзенскай вобласці Міністэрства ўнутраных спраў БССР – з 1 студзеня 1948 г.;

- бюро запісу актаў грамадзянскага стану выканаўчага камітэта Бераставіцкага раённага Савета дэпутатаў працуючых Гродзенскай вобласці БССР – з 1 студзеня 1957 г.;

- Бераставіцкі гарадскі пасялковы Савет дэпутатаў працуючых Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці БССР – з 1 студзеня 1963 г.;

- выканаўчы камітэт Бераставіцкага гарадскога пасялковага Савета дэпутатаў працуючых Гродзенскай вобласці БССР – са жніўня 1966 г.;

- бюро запісу актаў грамадзянскага стану выканаўчага камітэта Бераставіцкага раённага Савета дэпутатаў працуючых Гродзенскай вобласці БССР – з мая 1970 года;
- аддзел запісу актаў грамадзянскага стану выканаўчага камітэта Бераставіцкага раённага Савета дэпутатаў працуючых Гродзенскай вобласці БССР – са студзеня 1976 г.;
- аддзел запісу актаў грамадзянскага стану выканаўчага камітэта Бераставіцкага раённага Савета народных дэпутатаў Гродзенскай вобласці БССР – са студзеня 1980 г.;
- аддзел запісу актаў грамадзянскага стану выканаўчага камітэта Бераставіцкага раённага Савета народных дэпутатаў Гродзенскай вобласці Рэспублікі Беларусь – з кастрычніка 1993 г.;
- аддзел запісу актаў грамадзянскага стану Бераставіцкага раённага выканаўчага камітэта Гродзенскай вобласці Рэспублікі Беларусь – з сакавіка 1996 г.

Да органаў загса адносяцца не толькі аддзелы загса, але і сельскія выканаўчыя камітэты. Там праводзіцца рэгістрацыя нараджэння, заключэння шлюбу, смерці, устанаўлення бацькоўства, а таксама урачыстая рэгістрацыя вясельных юбілеяў. У розны час на тэрыторыі Бераставіцкага раёна была розная колькасць сельскіх Саветаў. Сталі гісторыяй Глебаўскі, Галынкаўскі, Кулеўскі, Данилкаўскі, Иодкаўскі, Иодичскі, Макаравецкі (Макараўскі), Сямёнаўскі, Хомонтовский, Тетерёвский, Жукевичский, Кватерский (Кватарскі), Грыцавіцкі, Пархімаўскі сельскія Саветы, якія раней існавалі на тэрыторыі Бераставіцкага раёна. У цяперашні час на тэрыторыі Бераставіцкага раёна рэгістрацыю актаў грамадзянскага стану ажыццяўляюць шэсць сельскіх выканаўчых камітэтаў: Бераставіцкі, Конюхоўскі, Малабераставіцкі, Олекшыцкі, Пагранічны, Эйсмантаўскі.

У архіве аддзела загса Бераставіцкага райвыканкама захоўваюцца запісы актаў грамадзянскага стану, састаўленныя з 1945 года па сапраўдны час.



Архіў аддзела загса Бераставіцкага райвыканкама




Кнігі запісаў актаў, складзеныя ў 40- 50 гады




Кнігі запісаў актаў грамадзянскага стану за 1945 год 20 стагоддзя



Сучасныя кнігі запісаў актаў грамадзянскага стану

Сучаснаму чалавеку складана уявіць, што галоўнымі інструментамі ў рабоце супрацоўнікаў органаў загса былі пёравая ручка і фіялетавае чарніла, якім запаўняліся ўсе запісы аб рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану і пасведчанні. Пазней пяро замянілі чарнільнай аўтаматычнай ручкай, яшчэ пазней – друкарскай машынкай. Але ўсё змянілася з развіццём інфармацыйных тэхналогій. Са з'яўленнем першых камп'ютэраў працэс апрацоўкі інфармацыі пачаткаў перараджацца. Палепшылася якасць дакументаў, скараціўся час на іх афармленне.

Камп'ютэрная рэгістрацыя актаў грамадзянскага стану ў нашым раёне стала ажыцяўляцца з 2006 года. Для аўтаматызацыі выпіскі і ўліку дакументаў загса была распрацавана і ўкаранёна ў дзеянне сістэма «ЗАГС». Дадзеная сістэма дазволіла не толькі замяніць друкарскія машынкі, але весці выпіску і ўлік запісаў актаў грамадзянскага стану, стварацъ з іх электронны архіў даных. Гэты момант можна лічыць пачаткам з'яўлення электроннай базы дадзеных запісаў актаў грамадзянскага стану.

Традыцыйна меркаванне аб рабоце загсаў складваецца па ўражаннях аб рэгістрацыі шлюбу, а астатняя работа застаецца, як правіла, "за кадрам". Але работа супрацоўнікаў загса манатонная, адказная і карпатлівая. Да паслуг органаў загса на працягу жыцця прыбягае, без перабольшання, кожны чалавек. Работнікі гэтай службы знаходзяцца разам з людзьмі ў самыя радасныя і горкія хвіліны. Падзеі, якія рэгіструюцца ў аддзеле загса, заўсёды праходзяць праз сэрца, як самыя лёсаносныя і значныя. Спецыфіка такой работы патрабуе не толькі высокага прафесіяналізма, юрыдычнай граматнасці, але і вялікай чуйнасці, такта, павагі да людзей, індывідуальнага падыходу да кожнага канкрэтнага наведвальніка.

Магчыма, некаторыя лічаць, што работа супрацоўнікаў загса дастаткова руцінная, не лічачы ўрачыстай рэгістрацыі шлюбаў і нараджэнняў. Але гэта падманнае прадстаўленне аб нашай рабоце. Руціна нам не пагражае. Удасканальваецца нарматыўна-прававая база, узнікаюць

міграцыйныя і другія праблемы, жыццёвыя калізіі, якія трэба дапамагчы вырашыць грамадзяніну ў адпаведнасці з заканадаўствам. Напрыклад, запрасіць дакументы з тэрыторыі замежных дзяржаў, унесці змяненні, выпраўленні і дапаўненні ў запісы актаў грамадзянскага стану, аднавіць страчаныя дакументы і другія не менш складаныя пытанні.

Акрамя таго, работа ў органах загса не з'яўляецца статычнай, яна мяняецца, удасканальваюцца формы работы. Адной з адносна новых форм работы з'яўляецца падрыхтоўка і выдача даведак і дакументаў на падставе тэлефонных званкоў (па папярэдняму запісу) для наступнай выдачы іх грамадзянам пры асабістым звароце. У аддзеле загса таксама існуе папярэдні запіс на рэгістрацыю заключэння шлюбу. Дзякуючы ўвядзенню гэтае формы работы, асобы, якія ўступаюць у шлюб, могуць запісацца на жадаемую дату на працягу ўсяго года, у тым ліку і па тэлефоне. Зараз гэта асабліва актуальна, так як шлюбы можна рэгістраваць у любым органе загса Рэспублікі Беларусь. У цяперашні час дазволена праводзіць урачыстую рэгістрацыю заключэння шлюбу па жаданні асоб, якія ўступаюць у шлюб, за межамі памяшкання органа загса. Па жаданні грамадзян урачыстая рэгістрацыя шлюбаў, нараджэнняў, вясельных юбілеяў праводзіцца ў нядзелю.